— Существует перспективный план развития города, согласно которому этот вопрос предполагается решить в 2004—2005 годах.

Мария РУСАКОВИЧ.

Любопытно

Кто не платит за парковки?

По словам ***Александра Скворцова,*** *за платные неохраняемые стоянки не платят сотрудники правоохранительных органов, госмедучреждений, служб и подразделений Министерства по чрезвычайным ситуациям, инвалиды, участники войн и депутаты всех уровней.*

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Грамадзянін Германіі Штотц павядзе смалявіцкіх сялян не па ленінскім шляху

Напрыканцы кастрычніка калгас "Ленінскі шлях" Смалявіцкага раёна канчаткова саступіў месца замежнаму прадпрыемству "Штотц-Агра". Агульны сход калгаснікаў (ужо былых) зацвердзіў справаздачу ліквідацыйнай камісіі, што была створана для юрыдычнага афармлення продажу калгаснай маёмасці нямецкаму прадпрымальніку Лорэнцу-Петэру Штотцу.

У вёсцы Забалоцце ішлі да гэтага тры гады. Юрыдычны бок пытання вырашаўся з цяжкасцю, з узаемнымі прэтэнзіямі ды непаразуменнем. Можа, таму, што членам ліквідацыйнай камісіі было шкада ставіць крыж на гаспадарцы, якой аддадзены лепшыя гады жыцця, можа, таму, што хацелі атрымаць за калгасную маёмасць па максімуме, можа, думалі, што багаты немец, калі ўжо да нас трапіў, то не спыніцца ні перад якой адвольна вялікай сумай. Па-другое, праца камісіі тармазілася з-за адсутнасці тэхнічнай дакументацыі на калгасныя аб'екты ды камунікацыі.

Усё гэта, вядома, раздражняла спадара Штотца. Ён хацеў, каб хутчэй вызначыліся яго правы. Калгаснікаў хвалявала іншае — адкупныя. Па папярэдніх падліках маёмасная доля кожнага павінна была скласці 1500 долараў, якія хацелася атрымаць як мага хутчэй. Вядома ж, людзі нашы прывыклі, што іх заўжды падманваюць розныя начальнікі. Таму канліфкт абрастаў чуткамі, скандаламі, падстаў для якіх на самай справе не было.

Сітуацыя выправілася сама па сабе. І заслуга ў гэтым таго ж грамадзяніна Германіі Штотца. Ён наладзіў справу ўжо ў першы сезон. Людзі сталі нармальна зарабляць і атрымоўваць грошы без усялякіх затрымак. Менавіта адказныя паводзіны спадара Штотца ў пытаннях выплаты заробкаў вельмі паспрыялі росту колькасці яго прыхільнікаў. Бо такая павага да сельскага працаўніка з боку начальства была і застаецца натуральным цудам. Да таго ж Штотц праявіў сябе як чалавек дэмакратычны і спагадлівы. Ён вітаўся з усімі за руку, уважліва выслухоўваў просьбы, стараўся па магчымасці дапамагчы. Адно толькі, з'яўляўся на мехдвары або на ферме вельмі нечакана, без усялякіх папярэджанняў. Пазаўчора толькі адляцеў у Нямеччыну, а сёння ўжо соўгаецца па Забалоцці. Для яго гэта было звычайным, бо ён хацеў з першых дзён дабіцца высокай адказнасці ад усіх работнікаў. Але гэтага многім бракавала. Таму яны палічылі Штотца жорсткім эксплуатататарам. У рэшце рэшт дайшло да таго, што капіталіст выказаў намер плюнуць на ўсё і вывесці бізнес за межы асобна ўзятага сельсавета.

Спадару Штотцу сапраўды надакучыла чакаць, пакуль улады вырашаць пытанне з яго правамі ўласніка. Ён быў незадаволены тым, што за старыя пабудовы, якія ўжо нікому не патрэбныя, хочуць, каб ён заплаціў больш, чым каштуе будаўніцтва новых. "Пры такім падыходзе ніякі інвестар да вас не прыйдзе", — зазначаў ён. Маўляў, трэба паважаць адзін аднаго, думаць, не як абрабаваць немца, а як сур'ёзна павесці гаспадарку далей.

Як адзначыў на агульным сходзе генеральны дырэктар замежнага прадпрыемства Штотц-Агра" Віктар Харошка, "немца вымусілі заплаціць за ўсё, нават за тое, што на другі дзень прыйшлося разбурыць". Тым не менш справу ўдалося наладзіць. Калі на момант падпісання дамовы аб стварэнні замежнага прадпрыемства ў калгасе працавала 115 чалавек, то зараз — 200. Што тычыцца памераў заробку, то механізатар Аляксандр Канюшык, які зараз вывозіць на чыгуначную станцыю Смалявічы "нямецкія" цукровыя буракі, атрымоўвае на рукі 300—320 тысяч рублёў. Крыху болей прыносіць дахаты жонка, якая працуе даяркай. Падкрэслім, што гэта ўжо пасля выплаты падаткаў, што называецца чыстымі. У той жа час намінальная сярэднямесячная зарплата (да выплаты падаткаў) склала ў краіне за студзень-жнівень бягучага года 239, а ў жніўні — 266 тысяч рублёў. У сельскай гаспадарцы заробкі ўвогуле склалі 66 працэнтаў ад сярэдняга па краіне ўзроўню. Так што Канюшык заробіць за год прыкладна 2000 долараў. Да таго ж пры падзеле калгаснай маёмасці яму дазволілі прыватызаваць кватэру ўсяго за 240 тысяч рублёў. Гэта меней кошту паслуг бюро тэхнічнай інвентарызацыі па афармленні дакументацыі на жыллё.

Аляксандр ужо ў сталым узросце, яму крыху за пяцьдзесят, і пасля заканчэння Смалявіцкага СПТУ ён нідзе, акрамя "Ленінскага шляху", не працаваў. Прычым працаваў добра, ледзь не кожны сезон перамагаючы ў спаборніцтвах камбайнераў. Былі і грошы, і пашана. Тым не менш да патрабаванняў спадара Штотца прывык не адразу. Нават звольніўся і перайшоў у іншую гаспадарку. На тры месяцы. Але там, як і ў большасці калгасаў, заробкі плацілі нерэгулярна, не грашыма, а мясам ды іншымі прадуктамі. Таму і вярнуўся да немца.

Штотц — не мецэнат, але ж ён і не крывапівец, не эксплуататар. Яго мэта — не толькі мець прыбытак тут, у Забалоцці, але і паказаць тутэйшым, што яны могуць добра зарабляць, калі звернуцца да сучасных тэхналогій, тэхнікі і арганізацыі працы, усяго вытворчага працэсу. Лічбы абнадзейваюць. Калі толькі пачыналі ў 2000 годзе, то сабралі 14 цэнтнераў зерня з гектара, праз год — 33, а потым і 51 цэнтнер.

Як бачым, ёсць пазітыўная тэндэнцыя, і яна можа быць захавана. 51 цэнтнер з гектара — гэта ўжо прыбытак, хоць і невялікі. Можа быць болей. Па надоях ужо выйшлі на 5000 кг малака ад каровы. І тым самым Штотц паказвае, што прыйшоў у Беларусь не толькі гандляваць, але і весці гаспадарку і такім чынам зарабляць грошы. А тым самым даказвае, што кожная беларуская гаспадарка можа мець тое ж, што і ў Забалоцці. Усё гэта мяняе псіхалогію людзей у лепшы бок: яны перастаюць быць утрымальнікамі і робяцца паспяховымі гаспадарамі.

Заўважу, спадар Штотц валодае адной з самых паспяховых фірм, што гандлююць сельгастэхнікай і тэхналогіямі, у тым ліку ва Усходняй Еўропе. Таму для поспеху ў асноўнай справе яму патрэбны добрыя паказчыкі непасрэдна ў вытворчасці сельгаспрадукцыі. Таму былы "Ленінскі шлях", а зараз "Штотц-Агра" — гэта вытворчы палігон галоўнай фірмы.

Вярнуся да тых дзён мінулага года, калі спадар Штотц выставіў ультыматум мясцовым уладам. Рэакцыя аказалася на карысць немца, чыноўнікам, відавочна, хацелася захаваць багатага інвестара ў сябе, стварыць прэцэдэнт прыцягнення ў аграэканоміку сталага і надзейнага капітала, а па-трэцяе, яны на самай справе не ведалі, што рабіць з гэтым трапіўшым у тупік "Ленінскім шляхам", які так і не стаў магістральнай дарогай у светлую будучыню. А апошняе дзесяцігоддзе ўвогуле вызначыўся поўным бязладдзем, хоць гаспадарку і спрабавалі выратаваць вельмі прафесійныя людзі. У 1992 годзе, калі шуганула ўверх інфляцыя, старшыня калгаса В. Купрэйчык, атрымаўшы падтрымку агульнага сходу, заключыў дамову з вытворчым аб'яднаннем "Амкадор", якое тады ўзначальваў Васіль Шлындзікаў, дэпутат Вярхоўнага Савета і вельмі паспяховы менеджэр. Стварылі сумеснае прадпрыемства "Амкадор-агра", якое прыняло на сябе фінансавыя абавязкі, калгас — вытворчыя. І справа пайшла вельмі добра з самага пачатку. Але пасля трагічнай смерці сп. Купрэйчыка некалькі спецыялістаў распрапагандавалі калгаснікаў, якія на сваім сходзе вырашылі аднавіць статус-кво і выгнаць гараджан з Забалоцця. Але далей новы "Ленінскі шлях" працаваў намнога горш старога, і праз некалькі гадоў стаў фактычным банкротам. Цяпер, калі пра гэта ўзгадваюць, то кажуць пра пяць чалавек, якія на самай справе развалілі гаспадарку. Таму Смалявіцкі райвыканкам і занепакоіўся: што рабіць з гэтым дабром і людзьмі, калі спадар Штотц на самай справе з'едзе? Зрабілі ўсё, каб памірыць гатовых разбегчыся партнёраў, што і было дасягнута дамовай у Гаспадарчым судзе.

Працэс, нарэшце, пайшоў у рамках дзейснага заканадаўства і атрымаў лагічнае завяршэнне. Пасля выплат па калгасных даўгах нават засталася нейкая не вельмі вялікая сума на выплату маёмасных паёў. Яе падзялілі на 400 чалавек пенсіянераў і працаздольных, і атрымалася каму 100 долараў, каму крыху болей.

...Я пішу гэтыя радкі і думаю: я ж сам нарадзіўся на тэрыторыі зніклага калгаса "Ленінскі шлях", у якім маці адпрацавала больш за паўсотні гадоў, у які дзед аддаў сваю зямлю і маёмасць. І вось такі фініш "Ленінскага шляху".

Не, прадпрыемства "Штотц-Агра", думаецца, чакае іншы лёс. Як і сённяшніх яго працаўнікоў. Грамадзянін Германіі Штотц павядзе смалявіцкіх сялян не па ленінскім шляху.

Канстанцін СКУРАТОВІЧ.

СЕ ЛЯ ВІ

І гэта эстэтыка?

Прыкладна два месяцы таму па загадзе сталічных улад пазачыняліся прыватныя кіёскі на вуліцы Якубава, што непадалёк ад універсама "Свіслач". Але шапікі ніхто не зносіць. Болей таго, нехта амаль адразу пасля іх закрыцця сарваў дах, а на некаторых — ралеты. Мясцовыя хуліганы павыбівалі шыбы.

Паглядзіце на гэтыя здымкі, якія я зрабіў, — ад шапікаў засталіся сапраўдныя руіны. Шкло ніхто не прыбірае, гэтаксама як і самі шапікі, — справа па далейшым "навядзенні эстэтыкі" не рухаецца ні на крок.

Раней людзі, асабліва ўвечары, калі дзяржаўныя гандлёвыя кропкі ўжо не працуюць, з задавальненнем зазіралі ў прыватныя кіёскі, якія ўтульна свяціліся ў цемры. Ішлі, каб набыць пакецік гарбаты, цыгарэты, мінералку... Цяпер гараджане рызыкуюць напароцца ў цемры на бітае шкло (вуліца Якубава час ад часу не асвятляецца) ці, на худы канец, надыхацца пылам ад смецця, якое ўжо пачало гніць унутры напалову разбураных кіёскаў.

Я вырашыў высветліць, хто нясе адказнасць за эстэтыку мікрараёна. Выконваючая абавязкі галоўнага архітэктара Ленінскага выканкама г.Мінска **Ірына ФІЛІМОНАВА** паведаміла мне, што *"шапікі па ўсім горадзе Мінску будуць і надалей убірацца — гэта адпавядае палітыцы гарадскіх улад", і "да 22 кастрычніка рашэннем выканкама самі прадпрымальнікі павінны былі ўбраць шапікі".* Тую ж ідэю выказаў і намеснік кіраўніка адміністрацыі раёна **Аляксандр КРАСУЦКІ,** які сказаў мне, што *"прадпрымальнікам прапанавалі ўбраць кіёскі ўжо даўно, але яны не спяшаюцца выконваць загад".* На пытанне, ці нельга паскорыць вываз кіёскаў, Аляксандр Мікалаевіч паведаміў, што *"ўсё гэта можа быць вырашана толькі праз суд",* а гэта, *"як вядома, справа не аднаго дня".*





Мне ўдалося звязацца з адной з гаспадынь шапікаў **Аленай КЛІМКОВІЧ,** якая прызналася, што шапікі не вывозяцца па простай прычыне — фінансавай. Каб разманціраваць шапікі, *"неабходна заказваць спецыяльную тэхніку, а на яе няма грошай".* Тым не менш Алена Вячаславаўна паабяцала, што паспрабуе знайсці грошы і звезці шапікі *"ў бліжэйшы час".*


Я, шчыра кажучы, не вельмі добра стаўлюся да самой ідэі закрыцця прыватнага гандлю ў шапіках у нашым горадзе, але і не падтрымліваю тых прадпрымальнікаў, якія сёння фактычна ствараюць на вуліцы Якубава крыніцу небяспекі. Можна было б чакаць і "бліжэйшага часу", як выказалася прадпрымальніца, але пабітае шкло ляжыць на тратуары па вул. Якубава ўжо зараз. А побач з гэтым шклом, дарэчы, кожны дзень гуляюць дзеці...

Пытанне гарадскому кіраўніцтву: угледзьцеся, калі ласка, у гэтыя здымкі і скажыце —- няўжо гэта і ёсць тая самая эстэтыка, за якую вы так змагаецеся?

Дзівіўся з фотаапаратам у Серабранцы Алесь СІЛІЧ.

СЛЫШАЛИ?

Лукашенко вызвали на теледуэль



Нет, не дает все еще спокойно уснуть многим нашим согражданам последняя передача Савика Шустера "Свобода слова" российского канала НТВ. Не успело общественное мнение утихомириться от наглых теленожниц руководителей доморощенных пропагандистских каналов ОНТ и СТВ, превративших передачу НТВ в дешевый пропагандистский ролик а-ля Йозеф Геббельс, как лидеры ведущих оппозиционных политических партий распространили открытое обращение к Александру Лукашенко с призывом организовать теледебаты в прямом эфире.

"Можно только приветствовать, — говорится в обращении, подписанном Винцуком Вечерко, Сергеем Калякиным, Анатолием Лебедько, Леонидом Лемешонком и Станиславом Шушкевичем, *— что благодаря телевидению другой страны население Беларуси хотя бы услышало реплики журналистов белорусских негосударственных изданий. В начале передачи Вы сделали публичное заявление, что большинство людей, собравшихся в аудитории, представляют оппозицию. Это неправда. Из 40 человек из оппозиционных структур и независимых СМИ, предлагавшихся для участия в российской телепередаче, в студию был допущен лишь один представитель оппозиционной партии — почётный председатель ОГП Станислав Богданкевич. Это было одним из условий Вашего участия в программе. Создается впечатление, что Вы и Ваше окружение упорно избегаете открытой дискуссии со своими оппонентами по важнейшим вопросам развития страны. Это не только откровенное нарушение Конституции, норм международного права, но и неуважение к гражданам собственной страны".*

"Пятерка" предлагает правителю *"провести открытые дискуссии на Белорусском телевидении по ряду важнейших вопросов внутренней и внешней политики". "Вы не можете отрицать,* — говорится в обращении к А.Лукашенко, — *что оно (Белорусское телевидение.* — **А.С.**) *содержится налогоплательщиками всей страны, а не только 25% Ваших сторонников. Где же здесь справедливость, о которой Вы так любите порассуждать?... Не надо бояться альтернативных взглядов и позиций. Доверимся нашим гражданам. Пусть люди сами определяют, где правда, а где ложь, кто болтает, а кто в состоянии созидать".*

Примет ли А.Лукашенко предложение лидеров оппозиционных партий? Я сомневаюсь.

Наталья ГАК.

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

ЛЮБОПЫТНО

В Китае закрывают храмы

В Китае в результате новой кампании против подпольных религиозных общин закрыто более 400 буддистских храмов и христианских церквей. Согласно правозащитным организациям, базирующимся в Гонконге, в провинции Чжэцзян, где в последние годы с ростом благосостояния населения увеличилось количество религиозных учреждений, власти начали их закрывать под предлогом ликвидации угрозы политической стабильности.

В общей сложности закрыто 392 храма и 10 церквей, сообщают правозащитники. Из их 24 буддистских храма и четыре церкви разрушены, а 92 храма перестроены в развлекательные центры.

Англичане предпочитают пиво Интернету

Самым полезным изобретением последних 40 лет англичане назвали приспособление, позволяющее при наливании пива из банки получать такую же пену, как из крана в баре. Таковы результаты опроса, проведенного на сайте английского технологического журнала T3. В голосовании приняли участие почти девять тысяч человек.

Приспособление на пивной банке, именуемое widget, значительно опередило такие немаловажные изобретения человечества, как Интернет, мобильная связь, контактные линзы, компакт-диски, собрав 48 процентов голосов опрошенных.

В Австрии закрылся приют, где жил Гитлер

В столице Австрии Вене закрылось старое общежитие, в начале прошлого века служившее пристанищем Адольфу Гитлеру. Представители городского муниципалитета заявили, что здание совсем обветшало и непригодно для жилья. Последние 230 постояльцев общежития были переселены в другой дом с более комфортными условиями. Основными жителями этого приюта были люди, страдающие от алкогольной и наркотической зависимости. Власти Вены, являющиеся владельцами общежития, планируют его продать.

Адольф Гитлер жил в этом здании с февраля 1910-го по май 1913 года. В то время он был молодым художником, целыми днями разрисовывавшим открытки в своей маленькой комнатке, чтобы хоть как-то обеспечить свое существование.

26 конгрессменов требуют отставки Рамсфельда

26 членов палаты представителей конгресса США выступили с резолюцией, требующей от Джорджа Буша отставки министра обороны Дональда Рамсфельда. "Эта резолюция должна воплотить в жизнь то, во что верят многие члены конгресса — американским солдатам в Ираке и всей нашей внешней политике будет намного лучше, если Дональд Рамсфелд покинет свой пост", — заявил конгрессмен Чарльз Рэнгел, входящий в состав инициативной группы. "Первым шагом к отправке наших солдат домой должна стать отправка домой Рамсфелда".

Текст резолюции содержит обвинения против главы Пентагона в том, что он ввел американскую общественность в заблуждение относительно хода военных действий в Ираке, не имея адекватного плана по оккупации территории, а также соответствующего оснащения для войск США. Инициативную группу составляют представители демократической партии. Голосование по резолюции, намеченное на конец ноября, вряд ли состоится из-за республиканского преобладания в конгрессе США.

Грузинская оппозиция собирает подписи за аннулирование результатов выборов

Грузинская оппозиция начинает сбор подписей под призывом к Конституционному суду Грузии объявить состоявшиеся 2 ноября выборы недействительными. Об этом сообщила одна из лидеров оппозиции, председатель парламента Нино Бурджанадзе на встрече с послами ряда государств в Тбилиси. Бурджанадзе сказала, что "встреча лидеров оппозиции с президентом Эдуардом Шеварднадзе накануне прошла безрезультатно, и в этой ситуации мировое сообщество остается единственной силой, которая может сыграть позитивную роль в проходящих в Тбилиси процессах".

Бурджанадзе встретилась с главами дипломатических миссий Израиля, США, Турции, Германии, Италии, руководителем миссии ОБСЕ. На встрече послы заявили, что не могут вмешиваться во внутренние дела Грузии, однако высказали мнение, что "желательно, чтобы возникшая кризисная ситуация в центре Тбилиси была решена в рамках юридических норм на основе согласия между оппозицией и властями".

Усачи и бородачи

120 усачей и бородачей из 9 стран участвовали в чемпионате мира по выращиванию совершенной растительности на лице. Самая представительная команда — немецкая — увезла из штата Невада 8 чемпионских званий.

Несмотря на то, что Карл-Хайн Гилле дрожал от волнения, помешать его роскошным, поистине императорским бакенбардам победить уже ничто не могло.

На чемпионате мира по "бородоростительству" в Карсон Сити (штат Невада, США) 63-летний торговый работник извел на свою растительность столько лака, что полученный результат не мог бы потрепать и сильный ветер. Гилле получил награды сразу по двум категориям. В классе "императорских бакенбард" и как абсолютный чемпион.

Чемпионат мира проходил впервые в Новом Свете. Только из Германии за океан устремилось 54 претендента, а всего участвовало 120 бородачей и усачей из 9 стран. Другие представительные команды послали Австрия, Италия и Швейцария. Самому старшему участнику — седобородому британцу — стукнуло уже 82 года. 12.000 км пришлось преодолеть для участия в конкурсе обладателю редкостных усов из Гонконга.

С ЛЕНТЫ БИ-БИ-СИ

Россия — «самая опасная страна в мире»

Если вас очень заботит собственная безопасность, не живите в странах бывшего Советского Союза. Подобный вывод можно сделать, изучив исследование известного французского Национального института демографических исследований. Его специалисты утверждают, что именно в этом регионе и, в частности, в России наиболее велико количество самоубийств и смертей в результате несчастных случаев.

"Синдром насильственной смерти" — именно такой термин употребляет автор исследования, французский ученый Жан-Клод Шене. По его мнению, количество летальных происшествий в странах бывшего СССР настолько велико, что заслуживает специального определения. Под понятием "насильственная смерть" авторы исследования понимают убийства, самоубийства, несчастные случаи на производстве и дорожно-транспортные происшествия.

В исследовании французских ученых сказано, что на каждые 100 тысяч взрослых людей в России каждый год приходится 221 насильственная смерть. Украина оказалась на втором месте печального рейтинга: здесь соотношение — 100 тысяч к 140. Далее следует Казахстан со 119 смертями.

НЕВОЗМОЖНОЕ

Ты мне брат, но истина дороже

Однояйцевые близнецы живут одной судьбой

Нет ничего более обидного для человека, чем услышать, что он похож на кого-то другого. Каждому хочется быть единственным и неповторимым. Каждому хочется, чтобы его индивидуальность проявлялась ярко и чтобы спутать его ни с кем было нельзя. С младых ногтей человек стремится к тому, чтобы хоть в чем-то быть не таким, как все. Но есть из этого правила исключение. Речь идет об однояйцевых близнецах, которые часто мистическим образом, даже будучи разлученными в детстве, в мелочах повторяют судьбу и привычки друг друга. Как будто близнецы смотрятся в зеркало, как будто ходят друг за другом тенью.

Сергей ЛЕСКОВ

Изучение однояйцевых, или монозиготных, близнецов — отнюдь не околонаучное развлечение, которое услаждает тягу к парадоксам и будоражит изнуренное сухими теоремами воображение. При видимой легкомысленности это важное для науки направление. Ибо на примере однояйцевых близнецов ученые могут приблизиться к ответу на принципиальный вопрос о том, как соотносятся наследственность и факторы среды. Спор, который оказался роковым для поколений российских генетиков, не разрешен до сих пор. На каждого человека влияют улица, семья и школа. Но каждому на роду написан его личный генотип, преодолеть который не может самый волевой человек. Мы уже не спрашиваем, кто прав — Мендель или Лысенко. Но нас волнует, до какой степени воспитание, то есть усилия человеческие, могут повлиять на то, что заложено Природой? Вопрос тревожит и современных теологов, вооруженных научными знаниями и рассуждающих в свете неопровержимых данных генетики о роли Провидения и личной воли в судьбе простого смертного.

На Западе собран богатый описательный материал о "параллельной" судьбе разлученных в детстве близнецов. Некоторые примеры стали классическими. Рожденные в 1933 году на Тринидаде близнецы Оскар Штор и Джек Юфе с младенчества, после развода родителей, не видели друг друга. Оскар с матерью уехал в Германию и стал ревностным нацистом. Джек остался на Тринидаде с отцом, еврейским коммерсантом. Джек исправно посещал синагогу и занял видный пост в религиозной общине. Только в 1979 году братья встретились. В аэропорту они легко узнали друг друга: оба были в очках в толстой роговой оправе и голубых рубашках с погончиками, оба носили коротко постриженные усы.

У Оскара и Джека обнаружилось сходство даже в бытовых привычках. Оба, едва зайдя в туалет, нажимали на кнопку смыва. Оба носили одинаковые браслеты на запястье. Оба предпочитали обедать в ресторане в полном одиночестве. Перед едой требовали очистить стол от всех предметов. Оба любили макать тост в кофе, читали журнал с конца и в присутственных местах пугали окружающих громким чиханием. Они имели одинаковую походку и манеру сидеть, говорили с одной скоростью, хотя Оскар знал только немецкий, Джек — только английский. А все потому, что нацист и иудей были братьями...

В том же 1979 году ученые, занимавшиеся исследованием сходства судеб однояйцевых близнецов, устроили встречу разлученных в возрасте 5 недель и усыновленных разными американскими семьями Джеймса Спрингера и Джеймса Левиса. Мало того, что их назвали одинаково, у каждого был брат по имени Ларри и собака по кличке Трой. Оба Джеймса в школе любили математику и ненавидели литературу. Женились Джеймсы на девушках по имени Бетти. Своих сыновей они назвали Алан. Обе семьи проводили каникулы в городе Санкт-Петербург во Флориде, куда ездили на автомобиле "Шевроле". Оба Джеймса работали на автозаправке и были избраны помощниками шерифа.

Оба в свободное время увлекались плотницким делом и черчением. Оба имели сходные проблемы со сном, в одном возрасте болели одними болезнями, курили одни сигареты, пили одни алкогольные напитки и даже матерились одинаково.

Перечень можно продолжать долго. Но есть не менее озадачивающие примеры "параллелизма" иного рода. Профессор Луиджи Гедда из Института Грегора Менделя в Риме изучил более 15 тысяч однояйцевых близнецов и установил статистически достоверную хронологическую связь в их судьбах. Причина этой связи не установлена. В телепатию в рамках официальной науки верить не хочется. Но других убедительных объяснений ментальной зависимости близнецов не подыскивается. Близнецы, даже находясь за сотни километров друг от друга, в один день сражаются на дуэлях, попадают в автомобильные и железнодорожные аварии, одновременно рожают детей, страдают от приступов одной болезни и даже, будучи совершенно здоровыми, обращаются к врачу с надуманными жалобами на ту хворь, которая донимает брата или сестру...

— Для меня в этом "параллелизме" нет ничего загадочного, — говорит академик Гарри Абелев. — Наши склонности заложены природой, мы живем в соответствии с генетической программой и чувствуем удовлетворение, когда реализуем этот неведомый нам план. В России хорошо известны близнецы биолог Жорес и историк Рой Медведевы. И хотя уже давно один из них уехал в Англию, оба были близки к диссидентскому движению, стремились к публичности, к политической деятельности, отличались честолюбием. И бытовые привычки у Роя и Жореса очень схожи.

Выходит, все разговоры о том, что нас воспитывает улица, семья и школа, — лишь для отвода глаз. Ничто нас не воспитывает. Какими родились, такими и живем. Трофим Лысенко был неправ — природу не переделаешь. Милостей от нее с пеленок не дождешься...

("Известия".)

КРОПКІ НАД «І»

Сумнае вакол смеху,

альбо Яшчэ раз пра аўтарства паэмы «Сказ пра Лысую гару»

Трыццаць два гады таму "незаконна", гэта значыць мінуючы цэнзуру, да чытачоў прыйшоў таленавіты сатырычна-гратэскавы твор, які стаў з'явай у гісторыі беларускай літаратуры, — паэма "Сказ пра Лысую гару". З той пары і чытачы, і пісьменнікі біліся ў здагадках, хто ж яе аўтар, хто стаіць за псеўданімам "Францішак Вядзьмак-Лысагорскі". І вось нарэшце таямніца адкрылася: аўтарства належыць народнаму паэту Беларусі Нілу Гілевічу, у чым, шчыра кажучы, ужо даўно мала хто і сумняваўся. Здавалася б — узрадуемся, павіншуем, хоць праз трэць стагоддзя шаноўнага Ніла Сымонавіча, падзякуем за яркую кнігу па-народнаму дасціпнага смеху.

Здавалася б... Але аказалася — у літаратурным цэху ўзрадаваліся не ўсе. І вакол смеху пачалося круціцца сумнае і недарэчнае.

Эстэтычная глухата — ці нешта горшае?

Сапраўды, у многіх чытачоў, асабліва ў асяродку беларускай інтэлігенцыі, усё менш заставалася сумнення, што аўтар паэмы "Сказ пра Лысую гару" — наш выдатны паэт Ніл Гілевіч. Патроху-патроху, па меры таго, як з'яўляліся ў друку яго новыя творы (раман у вершах "Родныя дзеці", паэмы "Ачмурэнне", "Гэй, наперад! Гэй, назад" і інш.), усё больш станавілася відавочным, хто ў беларускай літаратуры мог напісаць (і напісаў!) "Сказ пра Лысую гару". Ды і як было ўсумніцца, калі на якой старонцы ні разгарні паэму, з якой страфы ні пачні чытаць — бачыш: гэта ж Гілевіч! Толькі той, хто не ведае паэзіі Ніла Гілевіча, ці той, хто з'яўляецца яго зацятым зайздроснікам, можа не прызнаваць відавочнага. Гэта на самым пачатку 70-х, калі "Сказ" пайшоў па руках, называліся розныя прозвішчы, а не толькі Гілевіча. Але і тады, і пасля, аж да пачатку 90-х ніхто не ўспамінаў імя М.Аўрамчыка. І зразумела: для гэтага не было падстаў. Ні да "Сказа", ні пасля "Сказа" гэты ціхі лірык не напісаў ніводнага сатырычнага верша і ўвогуле твораў, якія б сацыяльна-маральнай праблематыкай і грамадзянскім тэмпераментам хоць неяк перагукваліся са "Сказам". Як гэта кажуць — днём з агнём не знойдзеш нічога агульнага.

Аднак жа на пачатку 90-х папаўзла чутка, быццам аўтарам "Сказа" з'яўляецца менавіта Мікола Аўрамчык. Сёння мы ўжо ведаем, адкуль яна папаўзла: сам пачаў даверліва, "па-сакрэце" гаварыць гэта многім сваім знаёмым. Якое на самай справе ён меў дачыненне да паэмы — перакана́ўча сказана ў артыкуле Н.Гілевіча "Як быў напісаны "Сказ пра Лысую гару" ("Народная воля", 30.08.2003 г.). Сказана пачціва, з павагай да творцы-калегі, што, дарэчы, падкрэсліў і прафесар Дз.Бугаёў: "А дзе Гілевіч перайшоў этычныя межы? Ён вельмі тактоўна прызнае заслугі Аўрамчыка" (Радыё "Свабода").

Сёння, калі зрабіў прызнанне сам аўтар, кожны, з кім я меў гаворку, мне кажа: "А я і не сумняваўся, што аўтар — Ніл Гілевіч. Па-першае, абсалютна яго почырк, яго мова, яго верш, яго непаўторна дасціпны смех. Па-другое, яго востры сацыяльны погляд на жыццё, на рэчаіснасць, на лёс Беларусі і беларускай мовы, яго боль за лёс роднай краіны. Паэма "Сказ пра Лысую гару", хоць і праменіцца гратэскавым смехам, прасякнута болем. Таму і прынялі і палюбілі яе чытачы і здагадваліся, а ў бальшыні былі ўпэўнены, хто яе аўтар.

Каравул, не той напісаў!

Было спадзяванне, што публічная спрэчка пра аўтарства паэмы "Сказ пра Лысую гару" закончылася, паколькі ўсё ясна: аўтар — народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. Але жаданне і далей раздзьмухваць літаратурны скандал сяго-таго не пакідае. Зноў і зноў гучыць расчараванне: "Не той напісаў".

Гэта стаўленне найбольш выразна выказаў супрацоўнік "ЛіМа" пісьменнік Л.Галубовіч ("ЛіМ" за 03.10.2003 г.). Вось яго пачуванне, пасля таго як прачытаў у "Народнай волі" артыкул Н.Гілевіча "Як быў напісаны "Сказ пра Лысую гару": "...Мне адразу стала не па сабе... О, як доўга, з якой цікавасцю ды імпэтам шукалі мы ўсім літаратурным кагалам і не знаходзілі аўтара! І вось, на табе!"

Што здарылася? Як разумець гэтакі цяжкі ўздых? А так і разумець: прыкрае расчараванне! Не той напісаў паэму! Ну, як жа: я, Галубовіч, маю сваю думку "пра значнасць творчага плёну Ніла Гілевіча" — і раптам — на табе! Гэта ж проста чорт ведае што! Не мог жа я так даць маху! Хоць і не стану вывучаць чарнавікі, супастаўляць і аналізаваць тэксты, цэлыя кнігі (яшчэ чаго не хапала!), але я ведаю ісціну...

Артыкул Л.Галубовіча ў "ЛіМе" ўразіў мяне нейкай нядобрасцю, я сказаў бы, неінтэлігентнасцю, з'едліва-куслівымі, абразлівымі выпадамі на адрас народнага паэта Беларусі. Чытаў і думаў: адкуль у яго такая фанабэрыя? Можа, Галубовіч зрабіў хоць адну дзесятую таго, што зрабіў для беларускай літаратуры, мовы, навукі і культуры, для нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі Ніл Гілевіч? Не падабаецца, што ў нас ёсць такая волатаўская, рэнесансная постаць? Што Ніл Гілевіч — любімы ў народзе і вядомы ў славянскім свеце паэт, бліскучы публіцыст, літаратуразнаўца і фалькларыст, заслужаны дзеяч навукі, шанаваны прафесар, нарэшце — аўтарытэтны грамадскі дзеяч, да голасу якога прыслухоўваецца, слову якога верыць культурная грамадскасць Беларусі? Нядаўна на адкрыцці юбілейнай выставы народнага мастака Гаўрылы Вашчанкі адзін з прамоўцаў сказаў: "Я ганаруся, што з'яўляюся сучаснікам такіх вялікіх беларусаў, як Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч, Гаўрыла Вашчанка". Можа, падобныя прызнанні не даюць спакою Галубовічу? Чамусьці няма ў гэтым радзе ягонага імя, як сцярпець такое?

У сувязі з прызнаннем Н.Гілевіча наконт аўтарства паэмы некаторым аж свярбіць паразважаць аб маральнасці і сумленні. Думаю, што ім лепш скіраваць гэтыя развагі да саміх сябе ці каго іншага. Гэта ж трэба дзівіцца, што Ніл Гілевіч, па прычыне сваёй прыроднай далікатнасці, столькі цярпеў тое, што цярпець было нельга. Мабыць, добрых дзесяць гадоў цярпеў, гледзячы, як чалавек, што мае "толькі ўскоснае дачыненне да "Сказа" (прызнанне самога М.Аўрамчыка), выдае сябе за аўтара гэтага твора. Нават не за сааўтара, а за аўтара!

Яшчэ дзесяць гадоў назад М.Аўрамчык (па яго ўласным прызнанні) сказаў М.Танку, Я.Брылю, П.Панчанку, Дз.Бугаёву, У.Паўлаву, В.Зуёнку і іншым, што аўтар "Сказа" — ён, і ніхто іншы. Ні пра якое сааўтарства ён і не згадваў. І ўсе, каму ён сказаў, паверылі. М.Танк нават у дзённіку запісаў: "Аўтар "Сказа" — М.А. Які малайчына! На ўзроўні "Тараса на Парнасе"! І ўсе, уведзеныя ў зман, сцвярджалі: аўтар паэмы — М.Аўрамчык.

Але за апошнія 4—5 гадоў, дзякуючы многім артыкулам у друку (прабачце, і маім таксама), пачало высняцца, што аўтар "Сказа" — Н.С.Гілевіч. І Аўрамчык, прыціснуты, як гэта кажуць, да сцяны, ужо гатовы быць хаця б і сааўтарам. Так, у часопісе "Дзеяслоў", №4, 2003 г., ужо заяўляе: "**Мы** пісалі з таварышам, **мы** напісалі". Нядаўна па Радыё "Свабода" ішла размова Міхася Скоблы з Дзмітрыем Бугаёвым і Міколам Аўрамчыкам. Бугаёў: "Даражэнькі Мікола Якаўлевіч, чаму вы мне і не толькі мне расказвалі "па-сакрэце", што вы адзін напісалі "Сказ пра Лысую гару"? Навошта вы наводзілі цень на пляцень?" І далей: "Вы ўвялі Танка ў зман, сказалі, што вы — аўтар, а ён і паверыў". І што ж на гэта адказаў Мікола Якаўлевіч? А нічога! Пык-мык — і толькі. Ну, а паглядзеўшы ў вочы? Што гэта і як гэта называецца? Чалавек, які сам заявіў, што мае толькі ўскоснае дачыненне да напісання, выдае сябе за аўтара! Дык як наконт сумлення і маральнасці, спадары Галубовіч, Барадулін, Сёмуха і іншыя?

Таленавітае — пакуль ананімнае?

Многія пытаюцца: чаму Ніл Сымонавіч толькі цяпер прызнаўся ў сваім аўтарстве "Сказа"? На маю думку, дык і разумна рабіў, што раней не прызнаваўся. Гэта дазволіла ўсім, хто хацеў, даць "Сказу" ўласную без аглядкі на імя аўтара ацэнку. Дазвольце прывесці некалькі водгукаў на паэму, аб якой праз 20 з гакам гадоў пасля з'яўлення паэмы вядомыя паэты, пісьменнікі, крытыкі гаварылі так ("Крыніца", №1—2 за 1995 г.): Дз.Бугаёў: "Бляск сатырычнага слова", "напісана вельмі вынаходліва і нават віртуозна, з выдатным майстэрствам"; У.Конан: "Яркі карнавальна-гратэскавы твор", "аўтэнтычны пісьменніцкі твор яскравага індывідуальнага стылю"; М.Тычына: "Вядзьмак Лысагорскі... усё падгледзеў і *геніяльна* "ўзнавіў у сваёй знакамітай паэме"; В.Тарас: "Гэта карыкатура мастака... вельмі дасціпная, вельмі таленавітая"; М.Гербчык: "Бліскучая старонка айчыннай літаратуры", "З ёй не мог параўнацца ніводны тагачасны твор", "Выклікала не толькі смех, але і горкія думкі пра час, пра век і пра эпоху"; Л.Арабей: "Усе прызнавалі, што паэма *"геніяльная"*, "бытавыя падрабязнасці засцілі ад высокага начальства глыбінны змест твора"; В.Жуковіч: "Можна ганарыцца мастаком, які дзесяткі гадоў таму даў такую трапную характарыстыку таталітарнаму рэжыму, намаляваў карціну страшэннага стану недухоўнасці, маральнай спустошанасці"; В.Макарэвіч: "Маленькі шэдэўр", аўтар якога "варты звання народнага паэта"; П.Місько: "У тую эпоху застою нібы падзьмула свежым ветрам. Як хапалі мы гэты азон!"; П.Макаль: "Глыток праўды"; А.Кудравец: "Якая праца праароблена і як здорава!"; У.Паўлаў: "У ёй прачытваўся і час, і век, і эпоха, норавы, звычаі, парадкі, у якіх існавала грамадства"; В.Каваленка: "Гэта была сенсацыя. Больш, чым сенсацыя. Па тых часах, калі з'явілася паэма, гэта быў, бадай што, літаратурны цуд", "атмасфера праўдзівасці выступала з усіх сэнсавых сітавін тэксту твора", "ніводзін твор, нават з самых выдатных, не меў такога хвалюючага, ажыятажнага чытацкага запатрабавання", "упэўнены, што аўтар паэмы з ліку самых таленавітых беларускіх паэтаў", які "валодаў унутранай свабодай паглядзець на ўсё з аддаленай маральнай дыстанцыі, не будучы сам умешаным у дачную "эпапею"; паэма "робіць гонар беларускай літаратуры" і, "безумоўна, зойме значнае месца" ў ёй.

Пікантнасць сітуацыі ў тым, што некаторыя пісьменнікі, дазнаўшыся, хто сапраўдны аўтар "Сказа", раптам сталі бэсціць тое, што трыццаць гадоў узносілі да нябёс. Так, Р.Барадулін сцвярджаў: "Напісана ўсё ж бліскуча, на высокім прафесіянальным узроўні". Цяпер для яго гэта ўсяго "міжсабойка". Вельмі правільна зразумеў значнасць паэмы Г.Бураўкін і ацаніў яе надзвычай высока: "з'едлівая іронія і ўражлівая панарама маральнай дэградацыі грамадства". Цяпер жа ён піша: "Капуснік з элементамі абагульнення", твор "не настолькі значны і таленавіты, каб з-за яго сварыцца". Вось так: уражлівая панарама дэградацыі грамадства імгненна абярнулася ў звычайны літаратурны капуснік.

Як гэта ўсё называецца і чым тлумачыцца? Няўжо трывіяльнай творчай рэўнасцю?

Але ж і аргументы!

У "Вячэрнім Мінску" (за 25.09.2003 г.) некалькі вядомых літаратараў (Р.Барадулін, В.Сёмуха, Г.Бураўкін) катэгарычна сцвярджаюць, што аўтарамі "Сказа" з'яўляюцца двое: Гілевіч і Аўрамчык. Гэта ж заяўляе ў "ЛіМе" і Л.Галубовіч. Якія выстаўляюцца аргументы, доказы? А такія, што смеху варта. Паводле Р.Барадуліна, Гілевічава доля ў паэме амаль ніякая, таму што... "ён быў кандыдатам у члены ЦК КПБ". І хоць насамрэч Н.Гілевіч ніколі не выбіраўся ў ЦК, больш таго — ні ў абкам, ні ў гаркам, ні нават у райкам не выбіраўся, і што ў 1971 годзе, калі паэма пісалася, ён наогул не быў членам партыі, — ну і што, хто цяпер будзе правяраць? Сказаў Барадулін — значыць, ведае, значыць, так і ёсць. Між іншым, Аляксандр Твардоўскі, будучы членам ЦК КПСС, рэдагаваў антырэжымны часопіс "Новый мир" і напісаў забойчую сатыру на рэжым "Цёркин на тым свеце". Па логіцы Барадуліна — гэта немагчыма.

В.Сёмуха... Ну, тут я лепш працытую: "Нават калі дапусціць, што ніводнага Аўрамчыкавага радка ў паэме няма, — дык ён жа перадрукоўваў, забяспечыў канспірацыю... Я лічу, што яны — два саўдзельнікі гэтай паэмы". Прабачце, нават каменціраваць не хочацца. Перадрукоўваў, рассылаў па пошце — значыць, ты сааўтар. І гэта ўсё — усур'ёз, з пэўным унушэннем чытачам.

І шаноўны Г.Бураўкін таксама заяўляе: "Я веру, што паэму пісалі Аўрамчык і Гілевіч". Веру — і ўсё! Ні доказы, ні аргументы не патрэбны. Добра, дапусцім, што сапраўды "Сказ" пісалі ўдвух. Дык вось перад намі твор, чытаем: у ім усё Гілевічава, усё — дух, мова, стыль, вобразная сістэма, верш, рытміка, інтанацыя, іронія, гратэск, па-народнаму дасціпны смех — усё! А дзе ж Аўрамчыкава — калі і ён пісаў? Дзе? І чаму не выйшла нешта трэцяе — сярэдняе? Удвух ці нават утрох, паважаны Генадзь Мікалаевіч, можна напісаць такую безаблічную, посную сухамяціну, як "Сказ пра Яфрэма Сакалова", дзе і не патыхае сапраўднай сатырай, гратэскам, дзе і намёку няма на жывы, дасціпны, народны па духу смех. А "Сказ пра Лысую гару" мог напісаць толькі адзін паэт — Ніл Гілевіч, як "Цёркін на тым свеце" мог напісаць толькі Твардоўскі.

Л.Галубовіч спасылаецца на прыклад Ільфа і Пятрова, якія пісалі свае раманы-фельетоны разам, удвух. Спасылка неправамерная. Рэч у тым, што Ільф і Пятроў — гэта фактычна адзін аўтар, нават у энцыклапедыях яны падаюцца не паасобку, а як адно цэлае. І натуральна, бо няма самастойнага мастака слова Ільфа і самастойнага мастака слова Пятрова.

Але я не магу ўявіць нешта трэцяе — сярэдняе, напісанае разам — па сказе, па абзацы — Шолахавым і Лявонавым. Не магу ўявіць і паэму, якую пісалі ўдвух, — па радку, па страфе — да прыкладу, А.Твардоўскі і, скажам, салодкагалосы лірык С.Шчыпачоў. Што гэта быў бы за цуд паэзіі?

Сам прэтэндэнт на сааўтарства М.Аўрамчык не перастае паўтараць: пісалі разам — кожны радок, кожнае слова, нават кожную рыфму. Спрабую ўявіць гэтае пісанне. "Цыркач скрывіўся, цыркнуў слінай і даў блатмайстару адказ, — напісаў Гілевіч і запнуўся, а Аўрамчык тут жа яго і выручыў, падказаўшы: — Ты і за плечы не закінеш, што ён нахляпае за раз". І ўдзячны Гілевіч запісаў. Або: "Тады, на сорам чалавеку, ад слаўных будняў у баку, — чыркануў Ніл Сымонавіч, адчуў, што выдыхся, а Аўрамчык тут як тут: — І ўзнік ганебны лозунг веку: г... трымайце на замку". Вось так, значыць, радок за радком і тварылі?

Ніл Сымонавіч пісаў пад дыктоўку Міколы Якаўлевіча? Дык чаму ў такім разе апошні за ўсё жыццё не надыктаваў сам сабе хоць адзін сатырычны верш?

Самае смешнае...

Самае смешнае ва ўсёй гэтай гісторыі тое, што спачатку на аднаасобнае аўтарства, а затым хоць на сааўтарства прэтэндуе паэт, які, падобна, і не ахапіў усёй значнасці, глыбіні і маштабнасці "свайго" выдатнага твора. За апошні час М.Аўрамчык паспеў ужо даць "Сказу" сваю, я сказаў бы, неверагодную для чытача з нармальным паэтычным густам ацэнку: "І тады і цяпер я не лічу паэму выдатным творам" (Радыё "Свабода"). "Гэта чысты раёшнік. Дарэмна ёй надаюць такое значэнне" ("Крыніца", 1995, №1—2). "Капуснік — і ўсё! Такая ёй і цана!" (Радыё "Свабода"). "Ды я яму адразу сказаў: дзярмо! Мне там падабаецца нямногае" ("Вячэрні Мінск").

І што вы, шаноўныя чытачы, на гэта скажаце? Пэўна такое: дык чаго вы, Мікола Якаўлевіч, прэтэндуеце на сааўтарства "дзярма"? Навошта вам гэтакі "гонар"? Хутчэй атрасіце рукі!

Магчыма, напачатку М.Аўрамчык і разлічваў, што разам з Гілевічам яны напішуць лёгенькі "капуснік" на пацеху саміх пісьменнікаў. Але, на шчасце, магутны талент паэта-сатырыка — не для капуснікаў. Н.Гілевіч адчуў і зразумеў, што "лысагоршчына" — гэта жыццёвы грунт для стварэння маштабнай мастацкай рэчы, камічна-сатырычнага абагульнення тагачаснай рэчаіснасці. Непасрэдны творчы ўдзел паэта-лірыка наўрад ці мог яму дапамагчы. І Ніл Сымонавіч, як ён шчыра сказаў у "Народнай волі", "узяў усю працу на сябе" і стварыў паэму, якая з усіх яго сатырычна-гратэскавых твораў найярчэй выяўляе адметнасць ягонага творчага "я".

Паглядзіцеся ў люстэрка, спадары

Завяршаючы гэты артыкул, думаю: ну, а што далей? Ну, папалівалі народнага паэта брудам, патапталіся па яго добрым імені, крывадушна-цынічна паабураліся яго "несправядлівасцю", пацешыліся пры гэтым, парадаваліся. Ну, а што, паўтараю, далей? І далей будзеце пампаваць гэту непрыстойную, замешаную на зайздрасці і злосці рыторыку? І як доўга? І ў імя чаго? У імя павагі і любові да беларускай літаратуры, да самой Беларусі? Паглядзіцеся ў люстэрка, спадары.

Ці здолее хто з вас абвергнуць аўтарства Ніла Гілевіча — не лаянкай, не брудам, а пераканаўчым усебаковым аналізам тэксту, чарнавікамі паэмы? Паспрабуйце — ваша права. Але прыміце загадзя мае спачуванні. Бо сёння ўсякая дыскусія на гэту тэму не мае сэнсу, справа абсалютна марная. Падабаецца гэта каму ці не, але імя аўтара паэмы "Сказ пра Лысую гару" названа — Ніл Гілевіч, і таму, як кажуць нашы рускія браты, "просим любить и жаловать".

А М.Аўрамчыку я хачу сказаць наступнае. Вы, даражэнькі, памыліліся ў свой час, калі ўнушылі сабе, што маеце права лічыцца сааўтарам паэмы. Даць Н.Гілевічу факты-рэаліі з Лысай гары, прысутнічаць пры напісанні ім асобных строф, быць першым слухачом твора, перадрукоўваць і рассылаць поштаю тэкст — гэта, прабачце, усё ж не падстава, каб прэтэндаваць на статус сааўтара. Увесь тэкст паэмы — ад пачатку і да канца — складзены, ці, скажам так, — пераплаўлены і адліты ў ідэйна-змястоўны і моўна-вобразны маналіт у горніле душы іншага паэта — Ніла Гілевіча. І тут ужо нічога не зробіш. І не крыўдаваць трэба, не злавацца, а радавацца, што дачыненне да "Сказа", хоць і ўскоснае, вам пашчасціла мець.

Яўген СТАСЕВІЧ.

Ганарар ахвярую на развіццё "Народнай волі".

Народная Воля · 12 ЛІСТАПАДА 2003 г.

ГЛЫБІНКА

Шрамы «халоднай вайны»

Іх ажно сорак пяць — непадалёк ад маёй вёскі, у густым бярэзніку, паўз які ідзе гравейка. Па ёй у жніўні 1968 года, калі савецкія танкі ўвайшлі ў сталіцу Чэхіі Прагу, прагрукацела ў бок таго бярэзніку 45 найноўшых танкаў Т-64 з даўжэзнымі гарматамі і прысадзістымі вежамі. Услед за імі туды скіраваліся і тры гусенічных бульдозеры, якія выкапалі пад шатамі бяроз капаніры глыбінёй у два з паловай і даўжынёй пяць метраў. На выпадак атамнай атакі НАТО, аб чым, памятаю, тады штодзень трубіла савецкая прапаганда.

Калі палітычныя страсці "халоднай вайны" прыастылі, танкі выйшлі са сваіх схованак і падаліся ў мястэчка Урэчча на пастаянную стаянку.

А капаніры ніхто тады і не падумаў засыпаць. За 35 гадоў тут выраслі маладыя бярозкі і ёлкі. Шрамы ж на зямлі так і засталіся...

Охі-ўздыхі па «бацьку ўсіх народаў»

Пра што, як вы лічыце, гамоняць у чарзе на працэдуры ў гарадской бальніцы пажылыя мужчыны? Пра цэны на прадукты, транспарт, камунальныя паслугі, што паўзуць уверх без супыну? Не ўгадалі! Усё — пра палітыку ды палітыку. З настальгіяй па адышоўшым у нябыт сацыялізму. Толькі я прысеў на лаўцы у чаканні выкліку, як над маім вухам схіліўся яшчэ не стары мужчына:

— Сталіна б сёння сюды, у Беларусь — у момант навёў бы парадак і ў эканоміцы, і на вуліцах, пакончыў са злачынствамі і п'янствам! Ведаеце, што ён перад вайной сказаў авіяканструктару Тупалеву? "Даю табе два месяцы тэрміну, каб новы савецкі бамбардзіроўшчык быў гатовы". І той сканструяваў у тэрмін — баяўся, што пасадзяць. Страх — вялікая сіла!

Я ледзь стрымаў свой гнеў і спакойна адказаў:

— Ведаеце, што зрабіў бы сёння ваш Сталін? Перасадзіў палову жыхароў Беларусі, а разумнейшых — расстраляў: вопыт і спрыт на тое ў яго багаты! А названы вамі Тупалеў, усёроўна адседзеў у адзіночнай камеры ў Бутырцы, яго штодня вадзілі на допыты і катаванні цэлых два гады, пакуль Берыя не перавёў у асобнае тэхнічнае бюро пры НКВД. І самалёт ТУ-2, які мог узляцець у неба яшчэ ў 1938 годзе, стаў на старт толькі ў маі 1941-га.

Тут да размовы падключыўся мужчына з "калодкамі" на пінжаку. Ён безапеляцыйна заявіў, што расійскія пісакі надта перабольшылі лічбы ахвяраў НКВД і што ў Сталіна, канешне, былі памылкі, але "асобныя" і зусім не такія "сур'ёзныя", каб іх раздзьмуваць...

Пэўна, спрэчкі нашы набылі такі эмацыянальны напал, што, каб не з'яўленне медсястры, невядома чым бы скончыліся. А я падумаў: з такім "электаратам", як гэтыя два сталіністы, нам яшчэ доўга бараніць сваю свабоду і незалежнасць.

Засмактала старшыню шклянка...

У 70—80-я гады калгас на Старадарожчыне, які ён узначальваў, ішоў у перадавіках, там не раз ладзіліся абласныя семінары, і гасцям было што паглядзець — на фермах, палетках, вуліцах, хатах хлебаробаў. Старшыню на той час — добрага сэрцам, гаспадарлівага маладжавага мужчыну — я ведаў асабіста, не раз бываў у калгасе і нават нарыс пісаў з той гаспадаркі ў абласную газету.

Пасля майго выхаду на пенсію нашы сувязі абарваліся надоўга. І раптам два гады таму ён пазваніў мне са Слуцка. Сказаў, што прыняў самы адстаючы ў раёне калгас. Я пажадаў яму поспехаў у нялёгкай справе. А праз нейкі час давედаўся, што новы старшыня не ўтрымаўся на пасадзе і года: спіўся, запусціў яшчэ больш і да яго развалены гаспадарку. Уладкаваўся... начным вартаўніком на нейкай базе.

Горка і балюча за ндрэннага ўвогуле чалавека і кіраўніка, якога засмактала горкая шклянка. Ды ён — хіба адзін такі сёння?

І гэта — інтэлігенты?

Знаёмаму выкладчыку адной з музычных школ, які падаваўся мне чалавекам разважлівым, удумным, я параіў пазнаёміцца з маёй улюбёнай газетай "Народная воля".

— Пожалуйста, очень буду рад, — сказаў ён.

У яго паштовую скрынку я ўкінуў тры газеты, у тым ліку і суботнюю, на васьмі старонках. Праз некалькі дзён ён патэлефанаваў мне і стаў скардзіцца на недахоп часу — вось, маўляў, нават не здолеў зазірнуць у мае газеты. Ды і наогул — палітыкай ён не цікавіцца:

— Хватает черноты и на экранах телевизоров.

Яшчэ нямала сустракаеш інтэлегентаў, якія хаваюць галаву ў пясок накшталт страуса, быццам іх нічога навокал не тычыцца. Яны нярэдка наракаюць на жыццё, але чамусьці чакаюць, што нехта за іх перайначыць лёс, а ім самім лепш не рыпацца... Не, гэта не інтэлігенты, калі "залягаюць на дно", а не абуджаюць розум іншых.

Мікола КУТНЯВЕЦКІ.

г. Слуцк.

СПОРТ

Хакеісты перамагаюць у Венгрыі

Нацыянальная зборная Беларусі па хакеі з шайбай паспяхова выступіла на турніры "Шасці зборных", які праходзіў у Будапешце. Каманда Міхаіла Захарава, у якой поруч з праверанымі байцамі выступала і моладзь, выйграла гэты турнір.

На папярэднім этапе беларускія хакеісты гулялі ў групе В разам з камандамі Украіны і Харватыі. Трыо каманд групы А складалася з гаспадароў турніру, а таксама зборных Славакіі і Галандыі. У сваім першым матчы на венгерскім лёдзе зборная Беларусі пераканаўча выйграла ў харватаў — 8:2. Матчы са зборнай Украіны заўжды складваюцца для нашай каманды вельмі напружана. Вось і на гэты раз перамога дасталася беларусам зусім не проста, з перавагай толькі ў адну шайбу — 4:3. Заняўшы ў сваёй падгрупе першае месца, беларусы трапілі ў фінал, дзе іх саперніками сталі хакеісты зборнай Венгрыі. Хоць па ходзе сустрэчы беларусы і саступалі сапернікам, праявіўшы характар, які ўвогуле ўласцівы камандам, якія ўзначальвае Захараў, беларусы перамаглі — 6:3.

У матчы за трэцяе месца славакі з такім жа лікам выйгралі ў каманды Украіны.

Самым выніковым па сістэме гол+пас на турніры ў Венгрыі ў складзе беларускай зборнай стаў Алег Антоненка, які закінуў 3 шайбы і зрабіў 5 галявых передач сваім партнёрам.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

О ВЕЧНОМ

«Люди должны расти духовно, чтобы в лоне Церкви добиться духовного спасения...»

*Собеседник журналиста "Народной воли" — клирик Свято-Петро-Павловского собора г.Минска, духовник Св.Елисаветинского монастыря и сестричества, **протоиерей Андрей (Лемешонок)***

— Ваше Высокопреподобие, на богослужении я видел, как многие прихожанки стояли без платков, каково Ваше отношение к этому явлению?

— Дело в том, что когда человек только приходит в храм, он приходит из мира, из суеты. Ему сложно сразу же принять смирение, ограничить себя, понять, что главное — не внешняя красота, а красота душевная. Женщина в миру старается выглядеть "по моде": распускает пышные волосы, разукрашивает себя косметикой и т. п. Бывая в храме, она понимает это, на голове появляется косынка, пропадает грим. Женщина, надевая косынку, старается быть похожей на саму Богородицу, которая покрывала голову. О необходимости присутствовать в храме с покрытой головою говорит в одном из Соборных посланий апостол Павел.

— Многих интересует такой вопрос: если человек, придерживавшийся неправославных взглядов, принимает православие, то нужно ли ему принимать Святое Крещение вторично?

— Если он был католиком или лютеранином, то нет. В остальных случаях — да. Католики должны лишь исповедываться, а лютеранин должен совершить миропомазание.

— Не менее модно сегодня обсуждать идею перевода богослужения на русский язык, так как церковно-славянский язык не всем понятен. Что Вы можете сказать читателям по этому поводу?

— В церковно-славянском языке — Дух. Перевод Священного Писания на церковно-славянский язык осуществляли духовно чистые люди — святые. Это совсем не то же самое, что сделанный нами перевод. Этот язык не опорочен матерщиной, его не слышно в пивных. Кроме того, какая духовная сила, какая поэзия заключена в каждом звуке этого языка! Для истинного православного этот язык не представляет препятствия. Наоборот, помогает оградить мысли о Боге от суетного мира. Не Церковь должна подстраиваться под людей, а люди должны расти духовно, чтобы в лоне Церкви добиться духовного спасения.

— Многие молодые пары удовлетворяются регистрацией брака в загсе, не считая нужным совершать венчание. Каково отношение Церкви к этому явлению?

— Освященная Церковью семья — принципиально более высока в духовном плане. Это уже маленькая церковь. Домашняя церковь...

— А как Вы смотрите на разводы?

— Развод — смерть этой домашней церкви. Это грех, большой грех родителей, которые женились не подумавши, чем в конечном счете заставили страдать детей. При этом не важно, обвенчана пара или зарегистрирована в загсе.

— Многие православные думают, что жизнь ушла вперед и посты утратили свое значение, что это пережитки прошлого, можно и без них обойтись...

— Ради своего тела, плоти, ради своей фигуры многие готовы выдерживать строжайшие диеты, голодания, но для Бога, для души они не хотят себя даже в чем-то ограничивать. Бог им судья. Такое отношение к посту говорит о моральном, духовном уровне тех, кому не стыдно высказывать вслух подобные суждения всерьез.

— А как должны вести себя те, кто по состоянию здоровья не может строго соблюдать пост?

— Они подходят к священнику, получают благословение и выполняют пост в той мере, в которой сие позволяет им их здоровье. Пост — это воздержание не только в еде, но и в слове, во взгляде, в действии, в развлечениях. Не пойти на дискотеку, не включить лишний раз телевизор — это также пост. Цель поста не в том, чтобы заморить себя голодом, а в том, чтобы помочь общению души с Богом.

— В обществе активно обсуждается план школьной реформы. Какую роль мог бы сыграть Закон Божий, будь он введен в школе?

— Если бы дети прикоснулись к Святому Евангелию, то никому от этого хуже не стало бы, особенно, учитывая обстановку с духовным воспитанием молодежи в нашей стране. Это воистину стало бы большой победой в борьбе за будущее человека. Но вести уроки по Закону Божьему должны не преподаватели, еще вчера преподававшие марксизм-ленинизм, а священнослужители.

— Как относится Церковь к пьянству и курению?



— Это грех. С ним нужно бороться, это нужно лечить. Прежде всего духовно. Лечить причину, породившую это зло. Я непосредственно занимаюсь этим делом. Мы лечим людей от этого греха на нашем подворье. Даем им новый смысл жизни. Вы сами видели: только после сегодняшнего богослужения ко мне обратились два человека с просьбой о помощи.

Поблагодарив Его Высокопреподобие за интересную беседу, я вышел из храма в надежде, что многое в нашей жизни изменится к лучшему, если чуть больше времени и внимания мы будем уделять душе, а не телу. Как сказал в своей проповеди отец Андрей: "Было бы очень большим шагом на пути спасения, если бы мы постигли смысл самой простой молитвы: *"Боже милостив, буди мне грешному!"*

Беседовал Антон ЛЮБИЧ.

12

лістапада

СЕРАДА

Усх. 7.32 Зах. 16.16
Даўж. дня 8.44
Поўня
9 лістапада

180 гадоў з дня нараджэння П. М. Шпілеўскага (1823—1861), беларускага пісьменніка, публіцыста, этнографа і тэатральнага крытыка

135 гадоў з дня нараджэння Г. Б. Місуны (1868—1922), геолага, першай жанчыны-геолага Беларусі

С ЮБИЛЕЕМ!

Александру Дракохрусту — 80!

Он — автор двадцати сборников стихов, недавно вышла вторая книга прозы. Прозы автобиографической и исповедальной.

Сын "врага народа", расстрелянного в тридцать седьмом, испытавший на себе гнетущую тяжесть незаслуженного изгойства, А.Дракохруст семнадцатилетним ушел на фронт и, пройдя всю войну, закончил ее в Берлине командиром штурмового саперного взвода.

Много лет А.Дракохруст отдал военной журналистике. И сегодня на его письменном столе — множество рукописей, которые ждут своего благодарного читателя.

С юбилеем, дорогой Александр Абрамович! Здоровья, творческого долголетия!

Предлагаем вниманию читателей "Народной воли" некоторые размышления Александра Дракохруста из его книги "Негаснущие зарева".

* * *

В Уссурийске в конце сороковых годов водку в ларьках продавали почти круглосуточно. Мой друг и начальник Коля Занин шутил по этому поводу: "Так заведено для того, чтобы любой патриот в любое время суток мог выпить за здоровье вождя!"

Во время одной из таких вечерних выпивок Занин разговорился и вспомнил, как вместе с Игорем Голубевым они были в командировке от окружной газеты в 5-й армии, в Пхеньяне, и выполняли там секретнейшее задание какого-то московского начальства. Их засадили в политотделе писать конституцию для Ким Ир Сена. "Ляпали" ее, по словам Занина, из разложенных на столе конституций союзных республик. А сам Ким, только что назначенный на должность "вождя корейского народа" и еще не понимавший толком, что сие означает для него и для Северной Кореи, все еще чувствовавший себя советским капитаном (а Коля был подполковником!), носился по городу на выделенной ему полуторке и добывал пиво для "создателей конституции".

Теперь о самом Киме. Скорее всего это легенда. Но очень в духе "великой эпохи". Впрочем, И.Б.Марморштейн, начальник 7-го (контрпропагандистского) отдела политуправления ПримВО, уверял, что это — правда.

Член военного совета округа Т.Ф.Штыков повез к Сталину двух кандидатов "на Корею" — Ти Ги Чена, прекрасного поэта, эрудита и умницу, и капитана Ким Ир Сена — партизана, комбата, сотрудника отдела спецпропаганды (его собирались выставить оттуда за необразованность и тупость).

Сталин с кандидатами знакомиться не пожелал. Выслушал короткий доклад Штыкова и лаконично изрек:

— Поэта не надо!

Ти Ги Чен погиб при первой американской бомбежке Пхеньяна. Его счастье! Всех бывших советских, и в особенности интеллигентов, Ким Ир Сен, "великий вождь корейского народа", маршал, герой, "незакатное солнце", со временем уничтожил.

А стихи Ти Ги Чена с удовольствием (это ее слова!) переводила Ахматова.

* * *

Человеческое сознание набито стереотипами. Изменения происходят медленно и мучительно. Даже желанную свободу оно принимает не сразу (на Руси — как "волю", как вседозволенность). Мысль о благе "крепостного состояния" еще долго довлела над сознанием нашего и невежественного, рабски забитого крестьянина после реформы 1861 года.

А сейчас? "Свобода", "независимость" и т.д. — пустые слова для тех, кто живет воспоминаниями об относительно дешевой колбасе и водке. Плен совковых стереотипов оказался очень прочным. Люди согласны даже на то, что им оставят единственное право — свободно кричать "ура". Герцен был прав, когда писал: "Нельзя освобождать людей больше, чем они освобождены внутри".

* * *

В наши дни, желая похвалить кого-нибудь, в особенности политика, общественного деятеля, публициста, о нем говорят: "Порядочный человек!".

Как же должно быть все извращено в обществе, насколько низко пало оно, если качество, считавшееся прежде (скажем, в дореволюционное время) непременной составляющей личности любого человека, я уже не говорю об интеллигентах, ныне является чем-то исключительным, чуть ли не знаком гражданской доблести, некоего редкостного отличия!

* * *

Итак, в Минске теперь своя Ходынка: станция метро на Немиге. Снова: "Немиги кровавые берега...".

Да, стихия есть стихия, толпа есть толпа. Н-н-о... В стране, где ментов и спецназовцев больше, чем солдат, на массовом "пивном" празднике силы порядка были представлены жалкой кучкой парней в камуфляже (кстати, почему милиция должна быть в камуфляже? Для устрашения, что ли?). В больших количествах — с водометами и собаками — они появляются лишь на митингах оппозиции.

Причина трагедии? Вырвавшееся на волю стадное чувство. Слепые инстинкты. Как и сто лет назад на Ходынке, они возобладали даже над элементарным чувством самосохранения. Сыграли свою роль и внутренняя распущенность, пьяный угар, люмпен-хулиганские замашки "крутых" парней и подражающих им.

Но поведение разнузданной шпаны, приведшее к трагедии, — лишь следствие, а не причина. Этого не хотят замечать. Даже отставки (лицемерные) не приняты. "Никто не виноват!" Вот так!

* * *

"Безоружный" ОМОН против вооруженных камнями мальчишек. Один из первых социальных взрывов поколения "не боящихся", выросших в условиях относительной свободы. В генах у этих ребят нет страха, который сковывал предыдущие поколения. Время покажет, сумеет ли власть напугать или "манкуртизировать" молодую поросль.

* * *

К вопросу о возможностях белорусского языка, его гибкости, живучести, семантическом многообразии.

Рыгор Бородулин в нескольких номерах "Полымя" публикует подборки подслушанных (а может, и частично сочиненных им самим) стихов — "Песні матчыны з Вушаччыны". Какая прелесть! Какой язык! Какое лукавство современного Нестерки! Кому бы это ни принадлежало — настоящий фольклор. Не только в слове — в самой ритмике дух народного сказа и пляса. Странно, что никто этого не замечает.

Рыгор не только знаток фольклора, не только эпик и тонкий лирический поэт, но и ядовитый сатирик. Недавно вновь убедился в этом. "Народная воля" воспроизвела известный снимок: Рыгор с черным котом на плече. А под снимком — новые строки, родившиеся в поездке по Принеманью:

Няма сумневу: ён даўно гатоў —
Указ чарговы, як заўсёды смелы,
Што трэба перафарбаваць буслоў,
Бо кожны бусел бел-чырвона-белы.

Я сразу же перевел:

Сомнений нет: уже готов указ,
Как водится,
решительный и смелый,
Чтобы сменить у аистов окрас —
Ведь каждый аист
бело-красно-белый.

Среда, 12 ноября

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Новости.
07.05, 8.10 "Доброе утро, Беларусь!" Информационно-музыкальная программа.
09.05 Мелодраматический сериал "Замок под солнцем" (Международный Французский Канал).
10.05, 17.05 Сериал **"Тайны четырёх преступлений"** (Италия). Фильм 1-й **"Смерть студентки".** 4-я серия.
11.05, 18.05 Детективный сериал **"Агентство НЛС-2"** (Россия).
12.15 Комедия **"Банзай"** (Франция).
14.05 Телеигра "Одноклассники".
14.45 "Моя страна".
15.10 Приключенческий сериал **"Амазонка"** (Канада-Германия). 1-я серия.
16.05 "5х5". Программа для молодежи.
19.15 Мелодрама **"Ботанический сад"** ("Беларусьфильм").
21.00 "Панорама". Информационный канал.
21.40 Боевик **"Без компромиссов"** (США).
23.30 "Чемпионы. Максим Мирный".
23.40 "Клип-обойма".
23.55 "Ночь с Тамарой Лисицкой".

ОНТ

08.00, 09.00, 18.00, 20.30, 23.20 Наши новости.
08.05 Телеканал "Доброе утро".
09.05, 19.05 "Земля любви, земля надежды". Сериал.
09.50, 22.10 Многосерийный фильм **"Дни ангела".** (Россия, 2003 год).
10.45 "Не только о футболе". Спортивное обозрение.
11.05 Дисней-клуб. "Чудеса на виражах".
14.40 "Город женщин". Телевизионное шоу.
15.30 "Фабрика звезд -3".
15.50 "Угадай мелодию" с Валдисом Пельшем.
16.15 Сериал **"Берег мечты".** 52-я серия.
17.05 "Большая стирка" с Андреем Малаховым.
18.15 Ток-шоу "Окна" с Дмитрием Нагиевым.
20.00 Время.
21.05 "Нина". Сериал. 2-я серия. (Россия, 2001 год).
23.35 "Фабрика звезд - 3".
23.55 "Закрытое досье. Смерть изгнанника". Документальный фильм.

РОССИЯ

07.45, 19.55 Телесериал **"Линии судьбы".**
08.45 Сам себе режиссер.
09.45, 21.50 Вести. Дежурная часть.
10.00, 19.00 Вести.
18.00 Выборы-2003.
19.30 Местное время. Вести-Москва.
19.50 Спокойной ночи, малыши!
20.50 Телесериал **"Оперативный псевдоним".**
22.00 Вести+.
22.20 "Авторитет с Дмитрием Киселевым". Никита Михалков.
22.50 Народный артист.

ЛАД

07.00, 14.00, 20.00 Новости.
07.10 "Четыре монеты" Мультфильм.
07.30 Мультсериал "Вокруг шпионы" (Международный Французский Канал).
07.50 "Эх, анекдот, анекдот". Юмористическая передача.
08.05, 22.15 Сериал **"Петербургские тайны"** (Россия).
09.00 Площадь искусств. Хор Михаила Турецкого.
09.30 "Есть только миг..." Анатолий Егоров.
10.00 "Между нами, женщинами". Тележурнал.
10.20 Сериал **"Ясли"** (Международный Французский Канал). 2-я серия.
11.15 "Обычный необычный день". Семейный канал.
11.50 Сериал **"Рожденная революцией"** (к/с им. А.Довженко), 6-я серия. **"Экзамен".**
13.25 "Обычный необычный день". Семейный канал.
13.45 "Котёнок по кличке "Гав". Мультфильм.
14.10 Мультиклуб.
15.05 Приключенческий сериал для детей "Собачья жизнь" (Канада-США).
15.30 "Огонь". Мультфильм.
15.45 "Не зевай!" Телеканал для детей.
15.55 Тележурнал для школьников "Бум".
16.25 Кинороман **"Дыхание грозы".** 1-я и 2-я серии. ("Беларусьфильм").
18.40 Сериал **"Рожденная революцией"** (к/с им.А.Довженко), 7-я серия. **"В ночь на 20-е".**
20.15 Колыбельная.
20.30 "Дела семейные".
21.15 Сериал **"Ясли"** (Международный Французский Канал).
23.10 Хоккей. Чемпионат Беларуси. "Витебск" - "Динамо" (Минск). 2-й и 3-й периоды.

НТВ

09.00 Сегодня утром.
09.20 Погода на завтра.
09.25 Кулинарный поединок: "Менты". Ларин против Абдуловой.
10.20 Ток-шоу "Страна советов".
11.00, 16.00 "Сегодня" с Кириллом Поздняковым.
14.35 "Неродной ребенок". Ток-шоу "Принцип домино".
16.30 Сериал **"Она написала убийство"** (США).
17.35 Чистосердечное признание.
18.00 "Сегодня" с Татьяной Митковой.
18.35 Премьера. Сериал **"Агентство "Золотая пуля". Дело о лопнувших агентствах".**
19.50 Остросюжетный сериал **"Черный ворон-2".** 14-я серия.
21.00 "Страна и мир". Главные события дня.
21.35 Красная стрела.
21.50 Премьера. Сериал **"Клиент всегда мертв".** 17-я серия (США).

СТВ+RenTV

06.25 "Пауэр рейнджерс, или Могучие рейнджеры". Телесериал.
06.50 "Трансформеры". Мультипликационный сериал.
07.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.50 "24 часа".
07.50 "СТВ-спорт".
08.05 "Минщина. Люди, события, факты".
08.15 "Минск и минчане".
08.25 "Технология".
08.40 Триллер **"Убрать Картера".** (США, 2000 г.).
10.20 "Автопанорама".
10.40 "Проект "Отражение": "В зоне поражения". Документальный фильм.
11.10 "Закон и криминал".
11.30 "Дикая планета": "Среди диких зверей". Документальный фильм.
12.00 "Истинная любовь". Теленовелла.
12.55 "Такая профессия": "Рекордсмен".
13.55, 18.35 "NEXT-2". Телесериал.
15.00 "Супершоу братьев Марио". Мультипликационный сериал.
15.25 "Маска". Мультипликационный сериал.
15.50 "Малыш и Карлсон". Мультипликационный фильм.
16.50 Детектив **"Выгодный контракт",** 2-я серия.
18.05 "Минщина. Люди, события, факты".
18.15 "Планета людей".
20.00 "СТВ-спорт".
20.15 "Минск и минчане".
20.25 Детский экран. "Добрый вечер, малыш...".
20.40 "Автопанорама".
20.55 Мелодрама **"Большие надежды".** (США, 1997 г.).
23.10 "Технология".
23.20 "Новости СНГ".
23.40 "Проект "Отражение": "В зоне поражения". Документальный фильм.
00.15 Детектив **"Газовый свет".** (США, 1944 г.).

8-Й КАНАЛ

17.30 "Мультпарад" от "Бюргера".
17.45 Фантастическая комедия **"Короткое замыкание - 1".**
19.15 Документальный сериал "За гранью реального".
19.40 К-видео "Топ-8".
19.45 Многосерийный фильм **"Клуб самоубийц".**
20.45 "Вечарніца".
21.00 Европа сегодня.
21.30 Детектив **"Последняя истина".**

ТВ ЦЕНТР

04.45 Информационно-развлекательный канал "Настроение".
07.50 Газетный дождь.
08.00 Выборы-2003.
08.30 "Времена не выбирают". Многосерийный телефильм.
09.40 Новый фасон.
10.00, 13.00, 17.00, 21.00 События. Время московское.
10.15 Телеканал "Дата"
11.15 Отдел "Х".
11.55 Квадратные метры.
12.10 Петровка, 38.
12.30 Деловая Москва.
13.15 "Инспектор Кестер". Детективный сериал (Германия).
14.30 Все о здоровье в программе "21-й кабинет".
15.00 Регионы: прямая речь.
15.30 "Расследование Элоизы Ром". Телесериал (Франция).
16.25 Выборы-2003.
17.15 Алексей Кравченко в программе "Приглашает Борис Ноткин".
18.00 "Загадочная женщина". Телесериал (Венесуэла).
18.50 Пять минут деловой Москвы.
19.00 Выборы-2003.
20.00 "Мужская работа". Телесериал (Россия).
20.50 МегаЛото.
21.40 Выборы мэра города Москвы-2003.
21.45 "Версты". Путешествие в Россию.
22.30 Времечко.
23.00 Петровка, 38.
23.20 25-й час. События. Время московское.
23.40 Серебряный диск.
00.00 "Шпионы". Телесериал (Великобритания).
01.00-01.35 "Синий троллейбус". Телефон доверия для полуночников.

EUROSPORT

09.30 Экстремальные виды спорта. Повтор.
10.30 Евроголы. Повтор.
11.30 Голливудский бульвар. Повтор.
12.30 Теннис. Хьюстон. Мастерс. Повтор.
13.45 Теннис. Хьюстон. Мастерс. Повтор.
15.00 Футбол. УЕФА. Повтор.
16.00 Снукер. Брайтон. Прямая трансляция.
19.00 Теннис. Мастерс. Хьюстон. Спецобзор лучших матчей.
21.00 Теннис. Мастерс. Хьюстон. Прямая трансляция.
22.45 Конный спорт. Кубок мира. Верона.
23.45 Парусный спорт.
00.30 Гольф. PGA. Основные моменты. Специальный выпуск.
01.30 Снукер. Брайтон.
02.30 Теннис. Хьюстон. Прямая трансляция.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэдактар нумара Алесь СІЛІЧ

Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №448 ад 15 мая 2000 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на УП «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 28 650 экз. Заказ № 834.